ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАУ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАУНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 2 (676) | Аўторак, 12 студзеня 1988 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## НАСЦЕННЫ ДРУК

Быў час, калі на эканамічным факультэце па-сапраўднаму чакалі кожны нумар сваёй насценнай газеты «Эканаміст». Яна выходзіла рэгулярна і вызначалася разнастайнасцю матэрыялаў, іх актуальнасцю, высокім мастацкім афармленнем. Газета шырока асвятляла насычанае жыццё факультэта, паведамляла пра ўсё лепшае, ускрывала і недахопы. Па крытычных матэрыялах прымаліся адпаведныя меры. Заканамерна, што з цікавасцю яе чыталі студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі, кожны, каму яна трапляла пад увагу.

Нязменным поспехам карыстаўся ў чытачоў і дадатак да насценнай газеты «Эканаміст» — «ЭВМ» (Эліксір Вясёлых Мінут). Словам, партыйная, камсамольская і прафсаюзная арганізацыі, дэканат эканомфака мелі баявы орган. Не выпадкова гэта газета на працягу некалькіх гадоў запар прызнавалася лепшай ва універсітэце па выніках агляду насценнага друку.

Але паступова «Эканаміст» пачала губляць сваю баявітасць, прыкметна змянілася ў горшы бок яе «твар». Не захоўваецца перыядычнасць выхаду газеты. Ва універсітэце яна страціла свае вядучыя пазіцыі. І ёсць падставы зрабіць вывад, што гэта на факультэце нікога не ўстрывожыла. Інакш, чым можна растлумачыць той факт, што прыйшоў новы год, а тут ніхто не паклапаціўся, каб выпусціць чарговы нумар «Эканаміста», дадатка да газеты альбо «Камсамольскага пражэктара». На сцяне сіратліва вісяць пустыя рамкі трох выданняў. І не скажаш, што гэтага не заўважае кіраўніцтва факультэта, тыя, хто адказвае за насценны друк. Проста ў адных не даходзяць рукі да справы, а ў другіх не хапае належнай патрабавальнасці да тых, хто лянуецца выконваць сваё грамадскае даручэнне.

Самым шматлікім па колькасці студэнтаў і свайго роду спецыфічным з'яўляецца гісторыка-філалагічны факультэт. Тут рыхтуюць спецыялістаў, прафесія якіх, здавалася б, сама абавязвае і натхняе да творчасці. Але калі пазнаёміцца з насценнай газетай «Праметэй», якая выходзіць на факультэце, дык гэтага не скажаш. Сведчаннем таму і яе навагодні нумар. Акрамя намаляванага Дзеда Мароза і напісанага навагодняга віншавання, змешчаны ўсяго толькі дзве заметкі аб Новым годзе ў Кампучыі і Кабуле, аўтарамі якіх з'яўляюцца замежныя студэнты. А як сустрэў новы годы калектыў факультэта — ні слова. Як быццам, няма ніякіх навін. Яны ёсць, і іх даволі шмат. Можна было расказаць чытачам, як студэнты і асабліва першакурснікі падрыхтаваліся да зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі, як на факультэце ўкараняецца самакіраванне і пра многае іншае. На жаль, рэдкалегія гэтага не зрабіла, абмежавалася найменшым укладам працы.

Перад тым, як пісаць гэты артыкул, мы азнаёміліся з насценнымі газетамі ўсіх факультэтаў. Ні адна з іх не парадавала. Іх рэдкалегіі павіншавалі студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў з навагоднім святам, а аб тым, як сустрэлі яго на факультэтах, — ніводнага радка. І гэта ў той час, калі вышэйшая школа знаходзіцца на важным і вельмі складаным этапе сваёй перабудовы, калі адбываюцца прыкметныя змены ва ўсіх сферах нашага жыцця.

Усе мы з павышанай увагай сочым цяпер за перыядычнымі выданнямі. Кожная газета як бы ўзмацніла свой зарад у барацьбе за хутчэйшае ажыццяўленне рэвалюцыйнага працэсу перабудовы, ухіленне меўшых месца недахопаў, укараненне ў практыку жыцця ўсяго новага, передавога. Дэмакратызацыя, галоснасць — адметныя рысы цяперашняга часу. У гэтым сэнсе вялікая роля павінна быць нададзена вузаўскаму насценнаму друку. Яго задачы — больш актыўна ўздымаць пытанні павышэння якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, шырэйшага далучэння студэнтаў да навуковай дзейнасці, выхавання ў іх актыўнай жыццёвай пазіцыі, рашучай непрымірымасці да ўсіх негатыўных з'яў і г. д.

Выпуск насценных газет на факультэтах пад больш строгі кантроль абавязаны ўзяць перш за ўсё партыйныя бюро. Неабходна пастаянна аказваць рэдкалегіям практычную дапамогу, вызначаць тэматыку матэрыялаў, указваць на недахопы і прабелы, якія патрабуюць асвятлення і неадкладнага ўхілення. Крытычныя матэрыялы, своечасовае рэагаванне на іх павысяць аўтарытэт кожнай насценнай газеты. Гэта прыдасць іх рэдкалегіям больш творчы запал, ініцыятыву. У канчатковым выніку насценны друк універсітэта эфектыўней паслужыць важнай справе ажыццяўляемай перабудовы.

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, кафедра фізічнага выхавання горача віншуюць кандыдата педагагічных навук МЯДЗВЕДЗЕВА Валерыя Анатольевіча з прысваеннем яму Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР вучонага звання дацэнт.**

## *ІМІ ГАНАРЫЦЦА УНІВЕРСІТЭТ*



Сярод васьмі імянных стыпендыятаў універсітэта ёсць і прозвішча Кацярыны Петракавец. Камсамолка вучыцца на трэцім курсе матэматычнага факультэта. Пасля цяперашняй залікова-экзаменацыйнай сесіі ёй будзе пройдзена палавіна шляху да пастаўленай мэты — набыцця спецыяльнасці матэматыка. З першых дзён вучобы Кацярына грунтоўна авалодвае праграмнымі дысцыплінамі.

Ленінская стыпендыятка К. Петракавец не толькі сама імкнецца глыбока авалодаць будучай прафесіяй, але як член акадэмічнага сектара факультэта гатова ў любы момант прыйсці на дапамогу таварышу.

У бягучым навучальным годзе Кацярыне аказалі высокае давер'е: яе выбралі ў састаў вучонага савета факультэта.

У час вучобы вольнага часу ў Кацярыны не шмат. Калі ж ён выпадае, дзяўчына захапляецца гульнёй у шахматы. У свой час па гэтаму віду яна выканала нарматыў кандыдата ў майстры спорту СССР. Кацярына неаднаразова з поспехам выступала на розных турнірах. Летась яна стала чэмпіёнкай Гомельшчыны.

**НА ЗДЫМКУ:** ленінская стыпендыятка Кацярына Петракавец.

Фота Л. Акінчыц.

## ВЕДЫ ПАВЫШАЮЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТЫ

З 1-га студзеня 1988 года ўступіў у дзеянне Закон аб дзяржаўным прадпрыемстве (аб'яднанні). Ён значна пашырае магчымасці кожнага калектыву ў рэалізацыі сваіх вытворчых праграм, планаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця, матэрыяльнага стымулявання за дасягненне лепшых вынікаў у працы. Неперааэцэннае значэнне мае гэты закон у перыяд пераходу розных галін гаспадаркі на поўны гаспадарчы разлік, самафінансаванне і самаакупнасць прадукцыі. Разам з тым перад кіруючым персаналам і спецыялістамі паўстала задача набыцця неабходных ведаў для паспяховай работы ў новых умовах. Вырашаць гэту задачу ў пэўнай ступені дапамагае факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі спецыялістаў, які ўжо другі год працуе ў нашым універсітэце.

У адну з груп факультэта ўваходзіць 29 чалавек сярэдняга кіруючага саставу: начальнікі цэхаў, намеснікі начальнікаў аддзелаў, вядучыя спецыялісты заводаў пускавых рухавікоў, радыётэхнічнага аснашчэння, «Крышталь». Усе яны з'яўляюцца рэзервам для вылучэння на кіруючыя пасады і спецыялізуюцца па арганізацыі кіравання вытворчасцю ў прамысловасці. Для слухачоў гэтай катэгорыі ўжо прачытаны лекцыі «Поўны гаспадарчы разлік і самафінансаванне», «Эканамічныя праблемы якасці прадукцыі», «Арганізацыя кіравання вытворчасцю», «Аўтаматычныя сістэмы кіравання вытворчасцю», «Гаспадарчае права» і інш. З лекцыямі выступілі загадчык кафедры галіновых эканомік прафесар С. А. Кім, дацэнты Я. Я. Вяршыгара, Т. В. Карпей, выкладчык курса савецкага права К. К. Ламчаноўскі.

## ПЕРАМОЖЦЫ ЎСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСУ

**Прэзідыум Цэнтральнага праўлення навукова-тэхнічнага таварыства машынабудаўнічай прамысловасці падвёў вынікі Усесаюзнага конкурсу на «Лепшую работу па стварэнню даўгавечных і надзейных вузлоў трэння машын і механізмаў? Першае месца прысуджана рабоце, аўтарамі якой з'яўляюцца загадчык кафедры фізікі цвёрдага цела нашага універсітэта прафесар В. А. Балакін, дацэнт гэтай кафедры І. М. Мельнічэнка, навуковыя супрацоўнікі М. П. Купрэеў і У. А. Замятнін. Яны ўдастоены Дыплома і грашовай прэміі ў размеры 800 рублёў. Іх распрацоўка зацверджана экспанатам на ВДНГ СССР.**

## ПЕРАДАПОШНІ КРОК ДА ДЫПЛОМА

Студэнты універсітэта пачалі здаваць экзамены зімовай сесіі. Для першакурснікаў — гэта пачатковае выпрабаванне, для іх старэйшых таварышаў — чарговая праверка ведаў. А вось пяцікурснікі ўжо, можна сказаць, на фінішнай прамой сваёй вучобы. У снежні яны здавалі сваю апошнюю сесію і цяпер знаходзяцца на перадыпломнай практыцы.

Як паведамілі нам у дэканаце эканамічнага факультэта, будучыя эканамісты па працы і інжынеры па арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі ў пераважнай большасці заканчваюць вучобу з добрымі і выдатнымі адзнакамі. Лепшыя вынікі паказалі групы ЭТ-51 і 0-51. Усе экзамены яны здалі без ніводнай нездавальняючай адзнакі.

Перáддыпломную практыку пяцікурснікі эканомфака праходзяць у асноўным на гомельскіх прадпрыемствах. Тэарэтычныя веды яны замацоўваюць у калектывах ВА «Гомсельмаш», «Гідрааўтаматыка», «Гомельдрэў», «Эмальпасуда», «Вымяральнік», «Камінтэрн» і на іншых вядучых прадпрыемствах горада.

Вялікая група пяцікурснікаў спецыяльнасці АМАЭІ праходзіць практыку на выпускаючай кафедры і кафедры ТСАЭІ свайго факультэта.

Трэба адзначыць, што тэмы дыпломных работ многіх выпускнікоў будуць цесна звязаны з вынікамі практыкі.

(Наш кар.)



Добра вучыцца студэнт гр. Т-41 эканомфака Уладзімір Маісееў. На экзамене па нарміраванню працы дацэнт В. А. Трухаў ацаніў яго веды вышэйшым балам.

Фота Л. Акінчыц.

# У ФОТААБ'ЕКТЫВЕ — СЕСІЯ

**Экзаменацыйныя білеты веерам раскладзены на стале выкладчыка. Секунды на роздум, ваганне (які з іх самы-самы шчаслівы!), і пальцы студэнта крыху нярвова выцягваюць білет.**

**Знаёмы малюнак ў час сесіі. Зноў паўнаўладна загаспадарыла яна ў нашым універсітэце. Здадзены залікі, цяпер студэнты трымаюць экзамены. Аб чым засведчылі іх першыя вынікі? З упэўненасцю можна сказаць: студэнты больш сур'ёзна рыхтуюцца да праверкі іх ведаў выкладчыкамі. У значнай ступені на гэта аказаў уплыў той факт, што цяпер у навучальным працэсе адводзіцца больш часу на самападрыхтоўку студэнта, а не на лекцыі. Гэта — патрабаванне часу, патрабаванне перабудовы вышэйшай школы. Да таго ж студэнт стаў добра усведамляць, чаго можа каштаваць яго нядбайнасць, лянота ў вучобе: не вытрымаеш экзамен, не ліквідуеш у тэрмін запазычанасць — ранейшай паблажлівасці не чакай.**

**Асабліва важна ўзяць паспяховы старт у вучобе першакурснікам. Ім трэба памятаць, што добрым спецыялістам стаць можна толькі тады, калі будзеш вучыцца старанна на працягу ўсіх гадоў вучобы ва універсітэце.**

**Ідуць экзамены. Наперадзе у студэнтаў шмат хваляванняў. Няхай спадарожнічае ім поспех!**



Набыць вышэйшую адукацыю па рускай мове і літаратуры прыехаў у наш універсітэт з Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан Башыр Рашэдаі. На мінулым тыдні ён трымаў свой першы экзамен — па гісторыі КПСС. На працягу ўсяго вучэбнага семестра юнак са стараннасцю вывучаў гэты курс. Як вынік — экзаменатар дацэнт Т. І. Язэпава ацаніла яго веды добрай адзнакай.



Марына Барышнікава, студэнтка 2-га курса эканамічнага факультэта, атрымала на экзамене па бухгалтарскаму ўліку, які прымаў дацэнт І. К. Кекіш, добрую адзнаку. А перад гэтым яна на «выдатна» вытрымала экзамен па медыцынскай падрыхтоўцы.

Фота А. Ульянкінай і Л. Акінчыц.

# ПОСПЕХ — НЕ ВЫПАДКОВАСЦЬ

Які студэнт не жадае выцягнуць на экзамене лёгкі білет? Напэўна, кожны. Калі ж на самой справе пашанцуе, і ў яго руках аказваецца гэты запаветны лісток з пытаннямі, якія добра ведаеш, вынікам, бясспрэчна, бывае станоўчая адзнака. Але тых, хто толькі і спадзяваўся на такое «студэнцкае шчасце», нічога не рабіў для таго, каб трывала засвоіць праграмны матэрыял, яно не выратоўвала. Каб такога не здарылася і ў ведамасці экзаменатара не з'явілася чарговая двойка, трэба сістэматычна, а не толькі на працягу некалькіх дзён і бяссоннай ночы перад самым экзаменам штудзіраваць канспекты і падручнікі. З такой думкай згодзяцца студэнты фізічнага і эканамічнага факультэтаў, якія здалі першыя экзамены бягучай сесіі на «добра» і «выдатна». Поспех на экзамене для іх — гэта не выпадковасць, а заканамернасць. Ён дасягнуты старанай вучобай у час семестра, актыўнай самападрыхтоўкай. Так, чацвёртакурснікі фізічнага факультэта атрымалі ў пераважнай большасці выдатныя і добрыя адзнакі на экзамене па фізіцы, які прымаў дацэнт У. С. Стрыжнёў. Другакурснікі таксама паказалі добрае веданне такіх прадметаў, як «Асновы вектарнага і тэнзарнага аналізу» і гісторыя КПСС.

Бухгалтарскі ўлік — дысцыпліна, бадай, адна з самых складаных для будучых эканамістаў па працы. Але без яе авалодання добрым спецыялістам не станеш. Вось чаму студэнты сур'ёзна адносяцца да бухуліку, рыхтуюцца да яго з усёй стараннасцю. Менавіта яе адзначыў сам экзаменатар дацэнт І. К. Кекіш у студэнтаў групы Т-23. Ён паставіў выдатныя адзнакі на экзамене па гэтай дысцыпліне Валянціну Жоглу, Міхаілу Русаму, Уладзіславу Краўчанку, Валерыю Санцу, студэнтам іншых груп.

Добрыя веды паказалі таксама другакурснікі спецыяльнасці АМАЭІ па гісторыі КПСС. Экзамен па гэтай дысцыпліне прымаў дацэнт Я. А. Семянчук.

Трэцякурснікі спецыяльнасці эканоміка працы здалі на мінулым тыдні экзамены па сацыялогіі працы і метадах сацыяльных даследаванняў, савецкаму праву. Вынікі таксама добрыя. У гр. Т-31 з 26 студэнтаў 17 атрымалі па першаму з названых экзаменаў выдатныя адзнакі. Пяцёркі пастаўлены на двух экзаменах студэнтам гр. Т-32 Я. Абраменка, І. Лосевай, А. Лаўрыненку, Л. Свістуновай. Паспяхова вытрымалі выпрабаванне на веды чацвёртакурснікі на экзаменах па нарміраванню працы, статыстыцы працы, эканоміцы працы, якія прымалі В. А. Трухаў, В. Е. Цішчанка і Э. І. Лізарава.

# ПАКУЛЬ НЕ ПОЗНА

На геалагічным факультэце першымі трымалі экзамены другакурснікі. Студэнты гр. ГФ-21 здалі экзамен па гістарычнай геалогіі дацэнту У. Э. Каўдэрку. С. Каваленка, С. Сатараў, Г. Хімуля атрымалі за свае адказы выдатныя адзнакі, дзевяці студэнтам пастаўлены чацвёркі і двум — «здавальняюча». Вынікі ж экзамена па палеанталогіі ў студэнтаў гр. Г-21 намнога горшыя. Прафесар Г. А. Кузняцоў ацаніў веды пяці студэнтаў на тройкі, а двум паставіў нездавальняючыя адзнакі.

Не можа не хваляваць той факт, што на факультэце ёсць нямала студэнтаў, якія не дапушчаны да здачы экзаменаў. На чацвёртым курсе іх чатыры, на трэцім — адзін, а сярод першакурснікаў ёсць нават такія, хто наогул не здаваў ніводнага заліку.

Вывады гэтым студэнтам трэба зрабіць самыя сур'ёзныя. І чым хутчэй, тым лепш.

Т. НІКАЛАЕВА.



Дацэнт С. А. Афонін застаўся задаволены адказам чацвёртакурсніцы фізічнага факультэта Іны Асламавай на экзамене па квантавай механіцы. Адзнака — «выдатна».

Фота Л. Акінчыц.

*РЭПАРТАЖ*

# ДЛЯ БУДУЧЫХ ФІЗІКАЎ

Яшчэ зусім нядаўна, здаецца, тут, непадалёку ад галоўнага корпуса Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта быў толькі катлаван. Потым работы крыху спыніліся. На гэта былі прычыны. А летам будоўля зноў «ажыла». У чэрвені спецыялісты з СУ-247 трэста № 14 пачалі рабіць цокальны паверх, а праз некалькі месяцаў за справу ўзяўся генпадрадчык — будаўнічае ўпраўленне № 84 гэтага ж трэста. Работа, як кажуць, закіпела.

У брыгадзіра комплекснай брыгады камуніста А. К. Анікеенкі гэта першы аб'ект, калі ён стаў брыгадзірам. Усяго некалькі месяцаў узначальвае калектыў.

— Брыгадзірскі хлеб не такі лёгкі, як думалася, — усміхаецца Аляксей Кузьміч. — Тут перш-наперш трэба быць добрым арганізатарам. А калі людзі ў калектыве працавітыя, то і справа заспорыцца.

Будаўнічае ўпраўленне № 84 з сакавіка мінулага года перайшло на калектыўны падрад. У новых умовах хіба што лайдакам было дрэнна. Каэфіцыент працоўнага ўдзелу біў па кішэні менавіта нядбайных. Прагуляў на рабоце — адпаведны заработак атрымай. Ураўнілаўка знікла.

— З першага студзеня 1988 года, — расказвае майстар БУ-84 У. М. Азараў, — упраўленне перайшло на самафінансаванне і самаакупнасць. Пра вынікі гаварыць яшчэ рана. Адно скажу, да новаўвядзення мы рыхтаваліся сур'ёзна.

Будуемы аб'ект вельмі складаны. Такіх карпусоў БУ-84 яшчэ не ўзводзіла.

— Праект індывідуальны, — тлумачыць майстар упраўлення М. Ц. Нікіцін. — І каб якасна рабіць цагляную кладку, патрэбны вопытныя муляры.

Яны, дарэчы, ёсць ва ўпраўленні. Узяць, напрыклад, А. А. Сялюціна. Здараецца, ён за дзень укладвае па 4—5 кубічных метраў кладкі пры норме 2. І што галоўнае, якасна выконвае сваю справу. Таму і КПУ ў Аляксандра Анатольевіча заўсёды высокі.

Нядаўна на гэтую будоўлю прыйшоў муляр пятага разраду, камуніст І. М. Бялоў. Ён звеннявы. Значыць, работа пойдзе яшчэ хутчэй. Нельга не адзначыць і муляраў У. П. Клыча, М. В. Міхалевіча, Я. І. Буглакова. На іх раўняюцца астатнія члены калектыву.

— Выдатна працуе на вежавым кране і былы воін-інтэрнацыяналіст Анатоль Юрчанка,— гаворыць брыгадзір. — Па-баявому, з агеньчыкам.

Усё новыя і новыя людзі прыходзяць на будоўлю фізічнага корпуса. Развітаўшыся са здатачнымі аб'ектамі, яны спяшаюцца сюды, дзе работа ў разгары. І вось ужо пачынае працаваць другая змена. Праўда, у ёй пакуль што ўсяго некалькі чалавек. Яны будуць рабіць мантаж пліт. Але, думаецца, другая змена хутка папоўніцца новымі рабочымі.

Ужо ўзведзены першы паверх вучэбна-лабараторнага корпуса фізфака. Між іншым, тут у будучым размесціцца вылічальны цэнтр, лабараторыі, кухня, буфет на 50 месц і іншае. Прадугледжаны і ліфты. Іх два. Кожны разлічаны на 12 чалавек. Безумоўна, вестыбюль і гардэроб таксама будуць.

Парадуюць студэнтаў і выкладчыкаў чытальная зала і факультэцкая бібліятэка, прасторныя аўдыторыі і спецыяльныя лабараторыі. Нават калідоры ў новым корпусе будуць больш утульнымі. Праз кожныя 25 метраў — хол. Столік, крэслы, кветкі. Чым не месца пагутарыць у час перапынку.

Новы корпус універсітэта нагадвае сабой літару «Г». Адна частка (тая, што працягнецца ўздоўж вуліцы Савецкай) — шасціпавярховая ды плюс сёмы тэхнічны паверх. А другая частка, што ў двары, будзе крыху ніжэйшай.

Галоўным архітэктарам будынка фізічнага факультэта з'яўляецца С. І. Пеўны з інстытута «Гомельграмадзянпраект». Дарэчы, Сяргей Іосіфавіч праекціраваў і цяперашні галоўны корпус.

Фізфак будзе аддзелены дэкаратыўнай тынкоўкай. Пасля першага паверха — арыгінальны казырок. Над цэнтральным уваходам ён крыху даўжэйшы. Завершыць будынак таксама «акантоўка», што зробіць корпус больш выразным.

— У будучым прадугледжваецца будаўніцтва яшчэ аднаго корпуса, — расказвае архітэктар С. І. Пеўны. — Ён далучыцца не толькі да фізфака, але і да цяперашняга галоўнага корпуса. Многіх, відаць, зацікавіць, а што ж будзе з вуліцай імя Цялегіна? Супакою, вуліца застанецца вуліцай. Уезд будзе ажыццяўляцца праз арку.

...Прыгажэе гэты раён Гомеля. У апошнія гады тут з'явіліся такія цудоўныя аб'екты, як гасцініца «Турыст» і ўнівермаг «Гомель». Думаецца, што новы корпус фізічнага факультэта, які ўзводзіцца, і той, будаўніцтва якога будзе распачата, таксама створаць выдатны архітэктурны ансамбль.

С. БЯСПАЛЫ.

ДА 45-ГОДДЗЯ СТАЛІНГРАДСКАЙ БІТВЫ

# НА ПОДЗВІГ КЛІКАЛА РАДЗІМА

Пачынаючы ваенныя дзеянні летам 1941 года супраць СССР, Гітлер ставіў сваёй мэтай у першую чаргу захапіць Маскву, таму на маскоўскім напрамку была сканцэнтравана найбольш моцная групоўка нямецка-фашысцкіх войск. Да сталіцы нашай Радзімы яны падышлі ў кастрычніку 1941 года. Нямецкае камандаванне настолькі было ўпэўнена ў хуткай перамозе над Савецкім Саюзам, што падрыхтавала ўжо помнік Гітлера, каб устанавіць яго на Краснай плошчы. Аднак 5—6 снежня 1941 г. савецкія войскі перайшлі ў контрнаступленне і разграмілі гітлераўцаў на подступах да Масквы.

Наш 48-ы гвардзейскі мінамётны полк «Кацюш», які ўваходзіў у склад Бранскага фронта, прымаў удзел у разгроме гітлераўскіх войск пад Масквой.

Пацярпеўшы паражэнне, гітлераўскае камандаванне вырашыла ўзяць рэванш — авалодаць Сталінградам, перайсці Волгу, зайсці ў тыл да Масквы і захапіць яе. Вось чаму на абарону горада на Волзе былі накіраваны ўсе лепшыя сілы нашай арміі. Восенню 1942 г. на абарону Сталінграда быў накіраваны і наш 48-ы мінамётны полк «Кацюш», які ўвайшоў у састаў 62-й арміі генерала Чуйкова. Мы вялі жорсткія баі на паўночных ускраінах Сталінграда. Мужна змагаліся савецкія воіны з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У цяжкіх баях тут загінула шмат нашых салдат і афіцэраў.

На ўсё жыццё запамятаўся мне адзін выпадак. На начальніка штаба дывізіёна Пятрова напалі некалькі гітлераўцаў. Ён забіў чатырох немцаў, а апошнім патронам пакончыў з сабой, каб не трапіць у палон. Я напісаў пра гераічную смерць Пятрова яго маці ў Маскву. Яна прыслала адказ, і ў яе пісьме была такая просьба: «Калі ты пасля вайны застанешся жывы, прыязджай да мяне ў Маскву, будзеш маім сынам. Калі гэтага табе нельга будзе зрабіць, прачытай маё пісьмо сваім сябрам і няхай прыедзе любы з іх. Ён будзе маім сынам». Да глыбіні душы кранулі мяне, маіх таварышаў па зброі гэтыя шчырыя словы савецкай жанчыны-маці.

200 дзён і начэй ішлі баі за Сталінград. Чорны дым ахутаў горад. Гісторыя вайны не ведала такой жорсткай бітвы. «За Волгай для нас зямлі няма!» — такую клятву далі абаронцы горада і ператварылі яго ў непрыступную цвярдыню. Баі ішлі за кожную вуліцу, кожны дом. Самыя жорсткія баі вяліся за Мамаеў курган. Неаднаразова гэтая вышыня пераходзіла з рук нашых войск да немцаў і наадварот. Наш полк «Кацюш» біў па кургану, каб выбіць адтуль фашыстаў. Тут, на гэтай галоўнай вышыні Расіі, як яна называлася ў дні баёў, вырашаўся лёс Сталінграда.

Пры падрыхтоўцы да акружэння гітлераўскай арміі, наш полк перавялі да раённага населенага пункта Клетск. Адтуль пачалося наша наступленне. З першых яго мінут мы ўдарылі па гітлераўцах усімі 24 «Кацюшамі». У распаленні праціўніка ўсё ўзрывалася, гарэла і дымілася. Затым у саставе 64-й арміі генерала Шумілава мы ўдзельнічалі ў баях за рад населеных пунктаў і, нарэшце, у раёне Калача сустрэліся з войскамі, якія наступалі з паўднёва-усходу на поўнач. Вакол 330-тысячнай арміі ворага замкнулася кальцо. Пачаліся баі па знішчэнню акружанай фашысцкай арміі. На ўльтыматум савецкага камандавання спыніць супраціўленне і скласці зброю камандуючы 6-й нямецкай арміяй фельдмаршал Паўлюс згоды не даў. Сам ён потым разам са сваім штабам быў узяты ў палон камандзірам 64-й арміі генералам Шумілавым у падвале гарадскога універмага. 2 лютага 1943 года гістарычная бітва пад Сталінградам закончылася поўнай перамогай савецкіх войск. Бліскучая перамога савецкага народа ў Сталінградскай бітве паклала пачатак карэннаму пералому ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны, прадвызначыла паражэнне гітлераўскай Германіі.

Радзіма высока ацаніла подзвіг абаронцаў горада. Баявых узнагарод удастоены звыш 50 злучэнняў і часцей, 700 тысяч салдат і афіцэраў былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, многія воіны сталі Героямі Савецкага Саюза.

У Сталінградскай бітве ўдзельнічаў і мой сябар дзяцінства гамяльчанін Пётр Лізюкоў. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ім у час баёў за горад на Волзе, ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. З баямі ён дайшоў да Кенігсберга, дзе камандаваў артылерыйскай брыгадай. Там ён і загінуў. П. Лізюкову прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Больш чатырох дзесяцігоддзяў прайшло з таго часу, як закончылася вайна, але асобныя яе эпізоды мне памятаюцца і па сённяшні дзень. Яшчэ больш яскрава паўстаюць яны перада мной, калі атрымліваю да свята — Дня Перамогі віншавальныя паштоўкі з тых месцаў, дзе давялося ваяваць. Так, напрыклад, штогод віншуюць мяне са святам школьнікі з раённага цэнтра Клетск Валгаградскай вобласці, які вызваляў ад гітлераўцаў наш гвардзейскі мінамётны полк. Такая памяць для нас, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, вельмі дарагая.

**П. ДУБРОЎСКІ,**
**ветэран вайны і працы,**
**заслужаны настаўнік БССР.**

# ПА КРЫВАВАМУ СЛЕДУ,

## НАСТОЙЛІВА ІШЛА АПЕРАТЫЎНАЯ ГРУПА

Нават у вопытных крыміналістаў, якія бачылі многае, сціснула сэрца. Ірына Сцепаненка — студэнтка чацвёртага курса Гомельскага дзяржаўнага універсітэта — выпадкова была знойдзена забітай ва ўласнай кватэры аднаго з дамоў па вуліцы Кірава ў Гомелі. Знойдзена родзічамі праз працяглы час, што мінуў пасля яе смерці.

Не магло не сціснуцца сэрца: на целе дзяўчыны 26 нажавых ран — адна глыбей другой. Адчувалася садысцкая рука забойцы, ягоная бязлітаснасць і жорсткасць.

Пракурорам вобласці, саветнікам юстыцыі трэцяга класа У. П. Гаўрыльчыкам і начальнікам УУС аблвыканкома палкоўнікам міліцыі В. С. Ізотавым неадкладна была створана сумесная аператыўна-следчая група з ліку работнікаў пракуратуры, крымінальнага вышуку УУС і Чыгуначнага райаддзела ўнутраных спраў.

Пошук ускладняўся даўнасцю забойства. Рэчавых доказаў было мала. Аператыўныя работнікі разумелі, што значную частку іх злачынца забраў з сабой. Дзе яны, хто забойца, — гэтае галоўнае схавалася за сямю замкамі. Іх належала адчыніць, дакапацца да ісціны.

Не будзем паглыбляцца ў прафесійныя тайны работнікаў пракуратуры і міліцыі. Раскажам пра іх тытанічную і аналітычную па сваёй сутнасці працу, пра бяссонныя дні і ночы пошуку.

Кожная версія, нават калі яна памылковая, мае сваю аснову, кожная патрабуе глыбокага аналізу, супастаўленняў, выхаду на тыя або іншыя факты і доказы.

Версій было многа. Тут трэба сказаць, што іх колькасць вызначалася асобай загінуўшай, асяроддзем, сябрамі і знаёмымі, якія яе акружалі. Пачаўся самы цяжкі перыяд выяўлення і гэтага асяроддзя, і сяброў, і многага іншага.

Ірына ў кватэры жыла адна: бацька і маці знаходзяцца ў камандзіроўцы за мяжой. У яе бывалі многія — студэнцкае жыццё шырыла кола знаёмстваў. Усё гэта ўлічылі работнікі групы — вопытныя крыміналісты. На рахунку следчага пракуратуры Аляксандра Мікалаевіча Дзядка — раскрыццё заблытанага забойства ў Мазыры. Намеснік начальніка аддзялення крымінальнага вышуку Чыгуначнага РАУС капітан міліцыі Уладзімір Віктаравіч Грэчанкоў мае рэпутацыю ўчэпістага работніка, а старшы оперупаўнаважаны аддзела крымінальнага вышуку УУС маёр міліцыі Якаў Міхайлавіч Юдовіч — чалавек, які можа выдаць мора ідэй, можа іх і ажыццявіць сам. Актыўна падключыліся да пошуку першы намеснік пракурора вобласці саветнік юстыцыі В. І. Шаладонаў, намеснік начальніка УУС аблвыканкома, палкоўнік міліцыі А. А. Кузьмянкоў, начальнік аддзела крымінальнага вышуку УУС падпалкоўнік міліцыі П. І. Здрок. Бы тыя лоцманы, яны дапамагалі арыентавацца аператыўнай групе ў складаным архіпелагу версій. Вось такія людзі разам ўступілі ў паядынак з нябачным праціўнікам. Да пары да часу назвалі яго Сяргей Д. Гэтаму буду следаваць і я. Сапраўднае прозвішча мы раскрыем пасля суда.

Зараз А. М. Дзядок кажа, што шукаць іголку ў стозе сена — рэч складаная. Але і не безнадзейная. Вялізнае мора чалавечых адносін можна вымяраць, калі гэтым заняцца як след.

Група працавала так, як трэба. Бы праз густое рэшата прасейвала версіі. На гэта спатрэбілася шмат часу. Ён ішоў, адмоўна адбіваючыся на думцы тых, хто ведаў Ірыну. «Марна ядзяць хлеб у міліцыі і пракуратуры» — традыцыйнае заключэнне абывацеля. Ды і не толькі ягонае: на жаль, папляткарыць любяць многія.

Аператыўнікі ж калясілі па многіх рэгіёнах краіны. І дыяметр круга пошуку станавіўся ўсё меншым. На планёрцы, якую часта праводзілі сумесна У. П. Гаўрыльчык і В. С. Ізотаў, упершыню прагучала імя Сяргея Д. Усталявалася цішыня: не можа быць, хлопец з такой сям'і...

Версію прывезлі з Украіны. У сяброўкі Ірыны, якая там жыве, аказалася яе пісьмо. Сцепаненка пісала, што ў лютым у іх кампаніі быў смешны курсант ваеннага вучылішча. За вечар прапанаваў кожнай з іх, хто там быў, неадкладна жаніцца. Яна параўнала яго з Хлестаковым: ды я, ды мне мора... Словам, у стылі Хлестакова.

Высветлілі, што сапраўды ў лютым мінулага года ён знаходзіўся ў Гомелі на канікулах. Быў ён тут і 20 жніўня. Таксама на канікулах. У гэты дзень не стала Ірыны. Было над чым моўчкі думаць на той планёрцы ўсім. Думалі пра тое, каб не памыліцца, каб не пакрыўдзіць, не абразіць падазронасцю чалавека.

Акуратна зрабілі запытанне ў вучылішча. Паступіў адказ: адлічаны за непаспяховасць і дрэнную дысцыпліну. Служыць у арміі. Салдатам. І ўказалі нумар вайсковай часці.

Ёсць у юрыстаў няпісаныя правілы этыкі: не лезь у чужыя справы — перашкодзіш; але калі цябе просяць, кроў з носа — дапамажы. У Гомель прыйшла папера: патрэбны кампетэнтныя людзі, якія ведаюць увесь ход справы: Сяргей Д., магчыма, той, каго шукаюць.

Ехалі ў Ленінград А. М. Дзядок і Я. М. Юдовіч не з пустымі рукамі. Быў у іх маленькі аргумент: адбіткі пальцаў на кафейным кубку, з якога нехта піў каву ў той трагічны дзень. Вядома, каву мог піць і нехта іншы...

Ваенныя крыміналісты, калі да іх звярнуліся з Гомеля, не сядзелі, склаўшы рукі. У іх аказаліся пісьмы бацькі і маці да Сяргея. Скажам прама: пісьмы-інструкцыі. Аўтару артыкула давялося іх чытаць. Асабліва вучыў бацька. Адчувалася, што ён многае ведаў, а пра тое, чаго не ведаў, — здагадваўся. Ведаў пра забойства Ірыны, пра тое, што сын быў знаёмы з ёю.

Сын нерваваў. Не вытрымаў, заказаў тэлефонную размову з бацькамі. Паколькі ён служыў дрэнна, выхад у горад яму забараняўся, і талон на размову прынёс салдат. Змест начной размовы вядомы: каб рэчы, якія вам падараваў, раз і назаўсёды зніклі з дому.

Цяжкія размовы былі ў Дзядка і Юдовіча з Сяргеем, які разумеў, чым усё пахне. Але ж спрацаваў доказ. Сышліся адбіткі пальцаў. Гэта пацвердзіла экспертыза ленінградскай міліцыі. Пісьмы, званок — усё было неабвержным і бясспрэчным.

Дзядка ў Гомелі чакалі справы. У Ленінградзе застаўся Юдовіч. Ён і прывёз прызнанне — яўку з павіннай.

Прывёз Якаў Міхайлавіч і яшчэ адзін важны дакумент. Пісьмо Сяргея Д. да сястры. «Аддай усе рэчы міліцыі», — наказваў ён.

Лёгка сказаць, аддай. Цяжэй з імі развітацца, калі прага і сквапнасць апанталі душу. У такім стане была сястра. З ёй размаўляў А. М. Дзядок. Доўга запіралася, аднеквалася. Растлумачыў, чым гэта можа скончыцца. Тады яна дастала з бюстгалтара 340 рублёў і паклала перад следчым:

— Асобныя рэчы збыла. Вось грошы.

— А дзе ж золата, упрыгажэнні Ірыны?

— Ніякай Ірыны не бачыла.

— Гэта і не трэба. Патрэбна золата. Дзе яно?

Маўчала-маўчала і раптам:

— У акардэоне.

Сястра гаварыла праўду. Сказала яна і пра тое, што футравая шапка і дублёнка знаходзяцца ў сяброўкі, якая жыве ў Рэчыцы.

З дазволу пракурора зрабілі вобыск у тых, у каго бацькі маглі схаваць астатнія рэчы. Усё выйшла без памылкі. Магнітафон японскай фірмы быў схаваны ў сяброўкі маці.

— Папрасіла — схавай. Муж маўляў, ездзіў за мяжу, прывёз. Баіцца начальства: дзе ўзяў столькі грошай, — растлумачыла сяброўка просьбу.

Хаваў, замятаў сляды і бацька. У яго таксама знайшлася сяброўка, пра якую не ведала жонка. Рэчавых доказаў станавілася, хоць адбаўляй.

...Мне давялося бачыць каляровы фільм. У рамках следчага эксперыменту. На працягу амаль дзвюх гадзін у кадры быў Сяргей Д. Былі панятыя, былі ўсе, каму належала пры гэтым быць. Скажу, што больш жудаснага і цынічнага відовішча бачыць не даводзілася.

Вось кватэра, дзе адбылося забойства. Сяргей Д. паказвае і сінхронна тлумачыць, як усё было, тлумачыць надзвычай спакойна: быццам пра нешта буднічнае і нязначнае. Але за ўсім праглядваецца драпежніцкая натура, сфарміраваная і выпеставаная ў такой жа драпежніцкай сям'і.

20 жніўня ён піў з жанчынамі ў рэстаране «Турыст». Тыя ад яго збеглі, і ён успомніў пра Ірыну. Дома яна была адна. Зварылі каву, пілі з бутэрбродамі (паказвае дзе). Сабраўся ўходзіць. Ірына пайшла за ім у прыхожую. Спрабаваў абняць — укусіла за палец. Раззлаваўся, узяў на кухні нож і двойчы ўдарыў у сонечнае спляценне. Ірына ўпала, і ён біў яе асцервянела, пакуль не стаміўся.

Ключы ад кватэры прыхапіў з сабою. Дзверы захлопнуў толькі на верхні замок. У гэтым быў разлік, бо назаўтра заявіўся сюды зноў. За ногі зацягнуў труп у спальню, сяк-так змыў кроў у прыхожай і пачаў шнарыць. Набіў сумку, што прынёс з дому. Прыхапіў яшчэ адну тут. Выбіраў самае лепшае: у доме многа добрых замежных рэчаў.

Прыйшоў і на наступны дзень. Узяў магнітафон, залатыя рэчы, частку кніжак. І спакойна, як ні ў чым не бывала, зачыніў дзверы...

Частку кніжак знайшлі ў доме бацькоў. На іх зрэзаны экслібрысы....

Каб усё высветліць, каб усё даказаць, аператыўна-пошукавая група тры з палавінай месяцы ішла па крываваму следу. У справы яшчэ няма канца. Але ён будзе. Будзе расплата.

**М. ДУБАВЕЦ,**
**спец. кар. «Гомельскай праўды».**

